http://www.uzdanews.by/?p=40718

Чырвоная Зорка

Грамадска-палітычная газета Уздзенскага раёна, выдаецца з 26 студзеня 1932 г.



# КВЕТКІ З ВОДАРАМ ШАТАКАНА

**18.03.2016**

***У гімназіі 12 сакавіка адбыліся 16-я Рэспубліканскія спаборніцтвы па шатакан каратэ-до "Гармонія шатакана", якія традыцыйна былі прысвечаны Міжнароднаму дню жанчын.***

Вызначальнай асаблівасцю праграмы спаборніцтваў з'яўляецца шырокае прадстаўніцтва дзяўчат-спартсменак, спартсменаў-бацькоў і інструктараў, а таксама спаборніцтвы па тушэнні свечак, якія лічацца ў шатакане своеасаблівым тэхнічным кантрольным тэстам майстэрства.






Ініцыятарамі і арганізатарамі правядзення спаборніцтваў з'яўляюцца Беларуская федэрацыя шатакан каратэ-до, адпаведны раённы клуб "Бушыдо". Спонсарамі спаборніцтваў выступілі афіцыйны дыстрыб'ютар прадукцыі ТАА "Супратэк" у Рэспубліцы Беларусь "РенСалАвто", індывідуальны прадпрымальнік Алег Латыш, аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама, раённая арганізацыя РГА "Белая Русь". Сярод ганаровых гасцей на мерапрыемстве прысутнічалі ***Святлана Вількіна*** (заслужаны майстар

спорту, шматразовая чэмпіёнка свету, суддзя міжнароднай катэгорыі), **Алена Корвін-Кучынская** (маці шасцярых дзяцей, прызёр міжнародных спаборніцтваў), **Ала Зінавенка** (намеснік старшыні райвыканкама), **Галіна Казлоўская** (дырэктар гімназіі), **Юлія Зяневіч** (першы сакратар райкама БРСМ).




Удзел у спаборніцтвах прынялі 177 спартсменаў з 18 клубаў усіх рэгіёнаў краіны. Спартсмены ва ўзросце ад 5-16 гадоў, а таксама спартсмены-бацькі прыехалі змагацца за перамогу. Барацьба прайшла ў 35 раздзелах спартыўнай праграмы.

Дастойна прадставілі каманду раённага клуба "Бушыдо" (дырэктар **Лілія Плахава**) каля 40 спартсменаў. На п'едэстал перамогі падняліся 16 уздзенцаў: **Вікторыя Пяткевіч, Сяргей Ярмашук, Аляксандр Ярашэвіч, Дар'я Касабуцкая, Фёдар Максімовіч, Багдана Сойка, Алеся Міхед, Жанна Пятроўская, Наталля Ватаманюк, Дзмітрый Колас, Уладзіслаў Пяткевіч, Аляксандр Жук, Мікіта Качур, Яўгеній Клакевіч, Яўгеній Ніканові**ч і **Георгій Мялешка.**

З нагоды свята жанчын былі заснаваны і спецыяльныя намінацыі з прызамі: "Самая юная ўдзельніца" (**Паліна Шакарава**), "Старэйшая мама" (**Святлана Вількіна**), "Самая ўніверсальная спартсменка" (**Ганна Свідзерская**), "Лепшая ў камандзе Уздзенскага раённага клуба " (**Алеся Міхед**) і "Самая абаяльная ўдзельніца" (**Аляксандра Булка**).

Для пераможцаў і прызёраў загадзя былі падрыхтаваны арыгінальныя медалі, дыпломы, спецыяльныя прызы. Як заўсёды, самым юным і старэйшым удзельнікам былі ўручаны памятныя сувеніры. Віншуем усіх пераможцаў і прызёраў спаборніцтваў!